Н. М. ПАНКОВА
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай культуры і фалькларыстыкі

# З ВОПЫТУ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «УНІВЕРСІТЭТАЗНАЎСТВА»

«Універсітэтазнаўства» – новая для нашай навучальнай установы дысцыпліна. Гэты курс быў распрацаваны для студэнтаў першага курса філалагічнага факультэта як агульнаадукацыйная дысцыпліна, якая заклік садзейнічаць развіццю гуманітарнай культуры студэнтаў у сукупнасці з прафесійнай адукацыяй. Менавіта «Універсітэтазнаўства» можа дапамагчы студэнтам-першакурснікам арганічна ўключыцца ў вучэбны працэс, асэнсаваць правільнасць выбранай спецыяльнасці і лягчэй адаптавацца ў новых рэаліях вучэбнага, навуковага і прафесійнага асяроддзя. Курс уключае ў сябе 14 лекцыйных і 6 семінарскіх гадзін.

«Універсітэтазнаўства» нездарма чытаецца менавіта ў першым семестры, калі студэнты яшчэ толькі пачынаюць уключацца ў навучальны працэс. Ступень падрыхтаванасці па спецыяльных прадметах і ўзровень агульнаадукацыйных ведаў у іх розная. Таму асаблівае значэнне пры выкладанні разнастайных дысцыплін (у тым ліку і «Універсітэтазнаўства») у першакурснікаў набывае ўлік індывідуальных адрозненняў кожнага з іх: навучанне павінна адштурхоўвацца ад ужо дасягнутага ўзроўню ведаў, які, зразумела, у кожнага са студэнтаў свой, і стымуляваць далейшае іх развіццё. Таму на ўводнай лекцыі была праведзена дыягностыка ведаў па дысцыпліне. Гэта дало выкладчыку магчымасць, улічваючы атрыманыя і прааналізаваныя вынікі, больш эфектыўна пабудаваць далейшы навучальны працэс. Студэнтам было прапанавана пісьмова адказаць на 25 пытанняў, якія ахопліваюць прычыны выбару менавіта гэтай вышэйшай навучальнай установы і дадзенай спецыяльнасці, удзел бацькоў (сяброў, сваякоў) пры прыняцці гэтага рашэння, веды па гісторыі, структуры і кіраўніцтве ўніверсітэта і факультэта. Былі таксама пытанні, звязаныя з ведамі аб лепшых сусветных універсітэтах, «мадэлямі» ўніверсітэцкага свету і шэраг іншых.

Па выніках гэтых анкет была праведзена гутарка, у ходзе якой сумесна са студэнтамі былі прааналізаваны адказы і зроблены высновы. Напрыклад, высветлілася, што 70 % студэнтаў не разумеюць адрознення ўніверсітэта і інстытута паміж сабой і шчыра напісалі, што не ведаюць, у чым яно заключаецца. Сярод найбольш «арыгінальных» адказаў можна вылучыць наступны: «Інстытут і ўніверсітэт адрозніваюцца: 1) назвамі; 2) у інстытутах вывучаюць, а ва ўніверсітэтах выкладаюць». 20 % студэнтаў далі даволі граматны

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

і асэнсаваны адказ, а вось 10 % упэўнена напісалі, што гэта адно і тое ж.

Пытанне, звязанае з веданнем лепшых сусветных універсітэтаў, таксама выявіла цікавую тэндэнцыю прыярытэтаў першакурснікаў. Прапаноўвалася назваць тры лепшыя сусветныя ўніверсітэты. Вынікі аказаліся даволі неадназначнымі: у шэраг лепшых універсітэтаў трапілі некаторыя беларускія ўніверсітэты (відаць, з патрыятычных пачуццяў): ГДУ імя Ф. Скарыны, Белдут, БДУ, Мазырскі педагагічны ўніверсітэт, Гомельскі медыцынскі ўніверсітэт. Пры гэтым 60 % студэнтаў да лепшых універсітэтаў свету аднеслі выключна беларускія вышэйшыя навучальныя ўстановы: на першым месцы апынуўся ГДУ імя Ф. Скарыны, на другім – БДУ, на трэцім – Белдут. 39 % аддалі перавагу замежным вну, сярод якіх на першым месцы апынуўся Оксфард, на другім – Гарвард, а на трэцім – Ельскі ўніверсітэт. 1 % з усіх апытаных не змаглі азначыць лепшыя сусветныя ўніверсітэты.

Апытанне выявіла, што большасць студэнтаў ведаюць, які ўніверсітэт быў створаны першым на Беларусі, знаёмы са структурай нашага ўніверсітэта, ведаюць кіраўніцтва факультэта і ўніверсітэта.

Цікавым для студэнтаў і для выкладчыка стала абмеркаванне вынікаў апытання на тэму, хто сапраўды жадае працаваць настаўнікам пасля заканчэння навучання. Анкетаванне паказала, што 55 % студэнтаў выбралі спецыяльнасць мэтанакіравана і сапраўды жадаюць працаваць у школе; 42 % адназначна далі адмоўны адказ, аргументуючы гэта «няўдзячнасцю прафесіі», «маленькім заробкам», «адсутнасцю духоўных каштоўнасцяў у сучасных дзяцей», «жаданнем працаваць у журналістыцы»; 8 % студэнтаў не ўпэўнены ў сваіх жаданнях.

Такім чынам, папярэдняя дыягностыка ведаў дала магчымасць выкладчыку вылучыць «белыя плямы» ў ведах студэнтаў, зразумець матывацыю выбару імі спецыяльнасці. Гутарка дапамагла і студэнтам, і выкладчыку асэнсаваць праблемы, звязаныя з атрыманнем вышэйшай адукацыі, сумесна акрэсліць шэраг тэм, на якія варта звярнуць асаблівую ўвагу ў працэсе далейшага навучання.

Варта адзначыць таксама, што ўводная лекцыя паказала, што да выкладання «Універсітэтазнаўства» нельга падыходзіць у форме цвёрдай вучэбна-дысцыплінарнай мадэлі, бо, па-першае, курс з’яўляецца факультатыўным і не прадугледжвае заліку ці экзамену ў якасці выніковай формы кантролю ведаў, а па-другое, традыцыйная лекцыя-маналог выкладчыка не вельмі спрыяе актывізацыі пазнаваўчай дзейнасці студэнтаў. Усё гэта вымушае шукаць такія формы работы, пры якіх адсутнічае цвёрдае кіраванне, каб студэнт не выступаў у ролі толькі выканаўца ці пасіўнага слухача, а быў гатовы да пастаяннага самаўдасканалення і самаразвіцця. Толькі пры гэтых умовах работа стане цікавай, а не вымушанай.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

У значнай меры гэтаму спрыяюць актыўныя метады і прыёмы навучання, якія пабуджаюць студэнтаў да мысленчай актыўнасці, праяўленню творчага, даследчага падыходу да пошуку новых ідэй пры вырашэнні разнастайных задач. Актыўныя метады прадугледжваюць пастаянную зацікаўленасць студэнтаў, павышаную ступень іх матывацыі і эмацыянальнасці, актывізацыю мыслення, а таксама пастаяннае ўзаемадзеянне выкладчыка і студэнтаў.

Прыкладам выкарыстання актыўных метадаў навучання можа служыць праблемная лекцыя. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што выкладчык на пачатку ці ў працэсе выкладання матэрыялу стварае праблемныя сітуацыі і прыцягвае студэнтаў у іх аналіз. Вырашаючы гэтыя праблемныя сітуацыі, яны самастойна могуць прыйсці да тых вывадаў, якія выкладчык павінен быў прапанаваць у якасці новых ведаў. Пры гэтым выкладчык падштурхоўвае студэнтаў да ўдзелу ў абмеркаванні. Такая лекцыя была праведзена ў межах тэмы «Мадэлі» ўніверсітэцкага свету». Студэнтам былі прапанаваны разнастайныя «мадэлі»: нямецкая (даследчы ўніверсітэт), брытанская (інтэрнатнага тыпу), французская («вялікіх школ»), амерыканская (чыкагская, гарвардская) і інш. Падчас праслухоўвання гэтай інфармацыі студэнты выказвалі сваё меркаванне наконт плюсаў і мінусаў кожнай з названых «мадэляў» і вырашалі, якую б з іх яны выбралі ў якасці найбольш прыярытэтнай. У той жа час ішло абмеркаванне прычын і ўмоў станаўлення той ці іншай мадэлі ў пэўнай краіне. На другім этапе лекцыі студэнтам было прапанавана ўявіць сабе мадэль універсітэта будучыні. Пры гэтым выкладчык ілюстраваў прапановы інфармацыяй аб тым, якія мадэлі ўжо былі прапанаваны (віртуальная мадэль, мадэль сеткавага ўзаемадзеяння, элітарная мадэль і інш.).

Напрыканцы абмеркавання разам са студэнтамі былі зроблены высновы:

– развіццё вышэйшай адукацыі ў кожнай краіне ў многім адлюстроўвае гістарычны шлях народа і дзяржавы, асаблівасці нацыянальных традыцый;

– калі ў XX ст. падкрэслівалася роля ўніверсітэта ў грамадстве як яго асноўнага сацыяльнага інстытута, задачамі якога было вытворчасць, развіццё і распаўсюджанне ведаў і культуры, то сёння становішча і арганізацыя ўніверсітэта выклікае шмат пытанняў і спрэчак, галоўнымі становяцца пытанні адаптацыі да сучасных сацыяльна-эканамічных і палітычных змен, пытанні місіі ўніверсітэта ў перыяд глабалізацыі.

Дзякуючы праблемнай лекцыі аўдыторыя паступова прывыкае да дыялагічнай формы заняткаў, калі выказванне меркавання заахвочваецца выкладчыкам, які пры гэтым дапамагае сфармуляваць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

думку, задае пытанні, ілюструе адказы студэнтаў прыкладамі і такім чынам стымулюе на сумесную творчасць.

Яшчэ адным прыкладам выкарыстання актыўных метадаў навучання пры выкладанні «Універсітэтазнаўства» можа служыць лекцыя–візуалізацыя ў рамках тэмы «Фарміраванне і развіццё еўрапейскіх універсітэтаў». Такі від лекцыі звязаны, з аднаго боку, з рэалізацыяй прынцыпу праблемнасці, а з другога – з развіццём прынцыпу нагляднасці. Перадача інфармацыі на гэтай лекцыі суправаджалася паказам відэафільма з серыі «Час истины» – «Студэнты Сярэднявечча. Эпоха Універсітэтаў», у якім вядучыя гісторыкі Расіі знаёмяць з бытам і нораваміі студэнтаў сярэднявечных універсітэтаў, працэсам іх навучання, універсітэцкімі статутамі таго часу, спосабамі стварэння першых еўрапейскіх універсітэтаў. Акрамя таго, на лекцыі былі прапанаваны структурна-лагічныя схемы, якія ілюструюць арганізацыйную структуру першых універсітэтаў і парадак прысваення вучоных ступеняў.

Такая нагляднасць кампенсуе недастатковую відовішчнасць навучальнага працэсу за кошт развіцця візуальнага мыслення і павышае эфектыўнасць успрыняцця і засваення інфармацыі, яе пераўтварэння ў веды. Акрамя таго, дадзены метад дазваляе павялічыць аб’ём перадаваемай інфармацыі за кошт сістэматызацыі, канцэнтрацыі і вылучэння найбольш важных элементаў.

Мы спыніліся толькі на некаторых аспектах выкладання дысцыпліны «Універсітэтазнаўства» і, зразумела, працэс яго ўдасканалення яшчэ наперадзе. Але ўжо першы год выкладання гэтай дысцыпліны паказаў, што менавіта актыўныя метады навучання з’яўляюцца найбольш эфектыўнымі, бо прадугледжваюць выкарыстанне разнастайных відаў вербальнай і невербальнай камунікацыі, актывізуючы схаваны пры традыцыйным падыходзе патэнцыял студэнтаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ